# ПРАЗ КНІГУ —ДА ДУХОЎНАГА АДРАДЖЭННЯ


Мова чыстых, спрадвечных славян,
Белы, тонкі зямлі нашай кужаль,
Старых кнігаў і граматаў здань,
Мова замкаў і прадзедаў мужных…
Ларыса Геніюш
Да дня беларускага пісьменства і друку

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 1998 г. № 157 "Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь" Дзень беларускага пісьменства штогод адзначаецца ў нашай краіне ў першую нядзелю верасня.

Традыцыйна свята пісьменства праводзіцца ў гістарычных і культурных цэнтрах нашай краіны, з якімі непарыўна звязаны жыццё і дзейнасць славутых дзеячаў Беларусі розных часоў. Штогадова ў святочных мерапрыемствах Дня беларускага пісьменства прымаюць удзел высокія афіцыйныя асобы Рэспублікі Беларусь, дзеячы літаратуры, культуры, навукі, мастацтва, журналісты, прадстаўнікі пасольстваў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, замежныя дэлегацыі.

За час свайго існавання Дзень беларускага пісьменства стаў па-сапраўднаму нацыянальным святам, значнай падзеяй культурнага жыцця краіны. Святочныя мерапрыемствы праходзяць не толькі ў горадзе-сталіцы, але і па ўсёй рэспубліцы. Гэта – тэматычныя ўрокі, лекцыі, семінары, творчыя сустрэчы з вучонымі, пісьменнікамі, дзеячамі культуры, педагогамі.

У аснову канцэпцыі Дня беларускага пісьменства пакладзена ідэя прапаганды здабыткаў айчыннай пісьмовай культуры, пераемнасці духоўных традыцый Беларусі.

# МІКОЛА ГУСОЎСКІ

Даследчыкамі дакладна не вызначаны гады жыцця і месца нараджэння паэта. Адно несумненна, што паэт – выхадзец з беларускіх зямель Вялікага княства Літоўскага. Найбольш верагодна, што нарадзіўся М. Гусоўскі ў сям'і велікакняжацкага лоўчага. З дзіцячых гадоў хлопчык прывучаўся да паляўнічай прафесіі. У вопытных лоўчых навучыўся будучы паэт чытаць кнігу роднай прыроды, адкрываць тайны звярыных сцежак, ведаць прыметы, якія дазвалялі прадказваць надвор'е і паляўнічае шчасце.

Напэўна, М. Гусоўскі пайшоў бы па слядах свайго бацькі, але эпоха Адраджэння адкрыла перад людзьмі новыя магчымасці.

Будучага паэта заўважыў сакратар велікакняжацкай канцылярыі Эразм Вітэлій (Цёлка), які выявіў у юнаку дасціпны розум і спрыт, прыблізіў да сябе, павёў у краіну навукі і культуры. Першапачатковую адукацыю М. Гусоўскі атрымаў у адной з кафедральных ці царкоўнапрыходскіх школ у Беларусі, паглыбляў веды ў Вільні, Польшчы і Італіі. Не выключана, што вучыўся ён у Кракаўскім і Балонскім універсітэтах. М. Гусоўскі стаў чалавекам высокай культуры.






У 1520–1522 гг. ён у складзе пасольства Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага пабываў у Італіі. У гэтай “калысцы Адраджэння” канчаткова сфарміравалася творчая індывідуальнасць паэта. Папа Леў X (Джавані Медзічы) быў прыхільнікам гуманістычных ідэй, велікасвецкага ладу жыцця. Менавіта па яго просьбе М. Гусоўскі ў 1522 г. стварае на лацінскай мове галоўны свой твор “Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго”. Напісана паэма на лацінскай мове – на той час мове навукі, культуры, міжнародных зносін у Еўропе. Аднак лёс твора аказаўся драматычным ад самага нараджэння: у снежні 1521 г. у час эпідэміі чумы памёр папа Леў X, а ў верасні 1522 г. – Эразм Вітэлій. З-за недахопу матэрыяльных сродкаў М. Гусоўскі павінен быў пакінуць Рым. Па дарозе дадому ён затрымаўся ў Кракаве, дзе ў 1523 г. паэма была выдадзена разам з некалькімі



Твор прасякнуты любоўю да роднага краю, глыбокім адчуваннем радзімы як месца адзінага і непаўторнага. Аўтар не толькі апісаў зубрыныя ловы. Ён стварыў узнёслую песню пра беларускую зямлю, пра тое, чым яна багата, пра яе людзей, іх думы і пачуцці, прыроду, жывёльны свет цудоўнага краю. Гэта споведзь пра любоў і нянавісць, жыццё і смерць, вайну і мір. Паэма заклікае сумленна жыць, змагацца за справядлівасць і праўду, весці няспынную барацьбу за мір і свабоду, за святло і шчасце.

У кракаўскі перыяд жыцця паэт напісаў і апублікаваў паэмы “Новая і слаўная перамога над туркамі” (1524) і “Жыццё і подзвігі св. Гіяцынта” (1525). На жаль, ні адзін з гэтых твораў не прыбавіў новых лаўраў у вянок паэта. Састарэлы, пакінуты лёсам і цяжка хворы, ён дажываў свае дні ў беднасці. Але да канца жыцця імкнуўся развіваць свае ідэйна-эстэтычныя прынцыпы.

Асобныя творы паэта перакладзены на польскую,

# Бібліяграфія

1. Гусоўскі Мікола [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 71–73.

2. Мікола Гусоўскі [Тэкст] // Гісторыя беларускай літаратуры : старажытны перыяд : вучэбны дапаможнік для філал. фак. пед. ВНУ / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі [і інш.] ; пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 3-е выд. – Мінск : Выш. шк., 1997. – С. 142–175.

3. Лойка, А. А. Мікола Гусоўскі [Тэкст] / А. А. Лойка // Старабеларуская літаратура : падручнік / А. А. Лойка. –

# КІРЫЛА ТУРАЎСКІ

Гонарам і славай беларускай зямлі з'яўляецца найбуйнейшы майстар слова, выдатны асветнік, філосаф і прамоўца, першы епіскап Тураўскай епархіі, адзін з высокаадукаванейшых людзей свайго часу Кірыла Тураўскі.

Нарадзіўся будучы асветнік у Тураве ў заможнай сям'і каля 1130 г. Свецкае імя яго не захавалася, у гісторыю ўвайшоў пад імем Кірыла, якое прыняў пры пострыгу. Атрымаў добрае хатняе выхаванне, пазней «спасціг вышэйшыя навукі і мастацтвы» ад грэчаскіх настаўнікаў. Рана пастрыгся ў манахі і заняўся літаратурнай дзейнасцю.

Каля 1144 г. Кірыла становіцца настаяцелем Нікольскага манастыра горада Турава. У 1148 г. ён зачыніўся ў манастырскай вежы, куды перанёс і сваю бібліятэку, каб поўнасцю аддацца роздуму, малітвам і літаратурнай творчасці, стаўшы, такім чынам, першым вядомым на Русі стоўпнікам. Прыкладна каля 1161 г. Кіеўскі мітрапаліт узвёў Кірылу Тураўскага ў сан епіскапа горада Турава, які ён насіў больш за 13 гадоў. Гэта быў першы за сто гадоў выпадак, калі епіскапам быў прызначаны мясцовы святар, а не прадстаўнік Кіева-





Тураўскі епіскап праславіўся як прапаведнік, выдатны майстар урачыстага царкоўнага красамоўства, які горача клапаціўся пра духоўную дасканаласць суайчыннікаў. З творчай спадчыны Кірылы Тураўскага зберагліся 3 выразна белетрызаваныя эпічныя тэксты (“Слова на сабор 318 святых айцоў”, “Слова ў памяць усіх святых”, “Канон і сціхіры на адыход найпадобнай княгіні Вольгі, бабулі Уладзіміра”), 8 "слоў"-пропаведзяў (“Слова на Вербніцу”, “Слова на Вялікдзень”, “Слова на Ушэсце” і інш.), некалькі дыдактычных аповесцей-прытчаў (“Аповесць пра беларызца і манаства”, “Казанне пра чарнарызскі чын”), 2 каноны, каля 30 малітваў-споведзяў. У асобных творах закранаў надзённыя маральна-этычныя праблемы, важныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця дзяржавы.

Творы Кірылы Тураўскага склалі залаты фонд старажытнарускай літаратуры і на працягу стагоддзяў карысталіся вялікай папулярнасцю на землях усходніх славян, перапісваліся да XIX ст. Яны змяшчаліся ў зборніках-анталогіях "Златоуст" і "Торжественник" побач з класічнымі ўзорамі антычнай аратарскай прозы, творамі Іаана Златавуста. Асобныя працы друкаваліся ў “Евангеллі вучыцельным” (Заблудаў, 1569), “Малітвах паўсядзённых” (Вільня, 1596) і інш.

Беларуская праваслаўная царква шануе Кірылу Тураўскага. У 1984 г. ён быў уключаны ў Сабор беларускіх святых, 28 красавіка (па старым стылі) – Дзень яго памяці. З 1995 г. перыядычна праводзяцца Тураўскія чытанні, прымеркаваныя да Дня беларускага пісьменства.

# Бібліяграфія


1. Вішнеўская, І. Кірыла Тураўскі – беларускі асветнік XII стагоддзя [Тэкст] / І. Вішнеўская // Юстиция Беларуси. – 2007. – № 1. – С. 29–31.
2. Гарэцкі, М. Кірыла Тураўскі [Тэкст] / М. Гарэцкі // Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 97–99.
3. Лойка, А. А. Кірыла Тураўскі [Тэкст] / А. А. Лойка // Старабеларуская літаратура : падручнік / А. А. Лойка. –

   Мінск : Выш. шк., 2001. – С. 83–103.
4. Кірыла Тураўскі [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 23–29.
5. Мельнікаў, А. А. Кірыл, епіскап Тураўскі : Жыцце, спадчына, светапогляд [Тэкст] / А. А. Мельнікаў. – Мінск. : Бел. навука, 1997. – 464 с.

# ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ



Сярод жанчын-асветніц Ефрасіння (Еўфрасіння) Полацкая з'яўляецца найбольш яркай постаццю. Першая жанчына гэтага перыяду, прылічаная да святых. Аднак жыццё і дзейнасць гэтай падзвіжніцы кніжнай справы на Беларусі, фундатаркі і педагога немагчыма апісаць грунтоўна з-за адсутнасці дакументальных крыніц. Нарадзілася ў Полацку. Год нараджэння дакладна не ўстаноўлены, а прыблізна акрэсліваецца 1101-1105 гг.

У дзяцінстве яна мела імя Прадслава і, як лічаць даследчыкі, паходзіла з княжацкага роду. У 12 гадоў Ефрасіння зрабіла найважнейшы свой духоўнамаральны выбар, які вызначыў увесь далейшы яе кірунак дзейнасці і сэнс жыццёвага шляху. Рашэнне пайсці ў манастыр і прысвяціць сябе служэнню Богу яна прыняла насуперак волі бацькоў, якія ўжо думалі пра яе хуткае замужжа. Не па гадах цвёрдая ў сваіх перакананнях Прадслава дабіваецца прыняцця ў манастыр, нарачоная імем Ефрасіння (па-грэчаску – радасць). Праз некаторы час, прыкладна каля 1120 г., Ефрасіння атрымлівае дазвол епіскапа Іллі і



Можна лічыць, што была створана майстэрня-скрыпторый, дзе працавалі апантаныя высокай ідэяй людзі: перапісчыкі, пераплётчыкі, мініяцюрысты і іншыя, адным словам - майстры кніжнай справы, галоўным клопатам якіх былі не фінансавыя прыбыткі, а імкненне данесці да людскіх сэрцаў хрысціянскае слова.

Верагодна, Ефрасіння не толькі займалася перапіскай кніг, але і сама пісала літаратурныя творы, якія не захаваліся. Існуе паданне, што яна мела дачыненне да стварэння летапісу Полацкага княства, які да нас не дайшоў.

У канцы 20-х гадоў XII ст. яна заснавала жаночы манастыр пры Спаскай царкве ў мястэчку Сяльцо непадалёку ад Полацка. Манастыр святога Спаса хутка набыў шырокую вядомасць. Па просьбе Ефрасінні бацька адпусціў у манастыр яе малодшую сястру Градзіславу (у маленстве Еўдакію) для навучання грамаце. Прыкладна ў 1129 г. у манастыр прыходзіць і стрыечная сястра Звеніслава (у маленстве Еўпраксія), ахвяруючы яму залатыя рэчы і шмат каштоўнасцей





Сваю вялікую справу Ефрасіння распачала не маючы нічога, акрамя хлеба і кніг, аднак неўзабаве ахвяраванні манастыру ўзраслі і гэта дало магчымасць пачаць будаўніцтва новай царквы святога Спаса. Будаўніцтва прайшло ў сціслы тэрмін-усяго за 30 тыдняў. Царква з'яўляецца дасканалым узорам полацкай архітэктурнай школы. Асветніцтва спрыяла ўпрыгожванню храма ўнікальнымі фрэскавымі размалёўкамі.

Пазней яна падаравала Спаскай царкве дарагі крыж, выкананы па асабістым заказе і эскізам Ефрасінні майстрам-ювелірам Лазарам Богшам у 1161 г., які стаў нацыянальнай святыняй Беларусі. Гэты ўнікальны помнік беларускай матэрыяльнай культуры бясследна знік у 40-я гады XX ст., але дзякуючы падрабязным апісанням у 1992-

Па ініцыятыве Ефрасінні каля 1150 г. непадалёку ад Полацка пачалося будаўніцтва царквы Багародзіцы, пры якой быў заснаваны мужчынскі манастыр.

На схіле дзён Ефрасіння адважылася на духоўны ўчынак. У сярэдзіне зімы 1167 г. яна разам з іншымі спадарожнікамі накіравалася ў паломніцтва ў Іерусалім. Пасля непрацяглага наведання Канстанцінопаля Ефрасіння нарэшце дасягае мэты свайго падарожжа. Але там аслабелая жанчына цяжка захварэла і 23 (24) мая 1167 г. памерла. У літаратуры смерць Ефрасінні датуецца 1173 г., што вымагае далейшых даследаванняў. Пасля заваявання Палесціны ў 1187 г. рэшткі цела (мошчы) Ефрасінні былі вывезены і змешчаны ў дальніх пячэрах Кіева-Пячэрскай лаўры. І толькі ў 1910 г. цела асветніцы вярнулася з трыумфам на радзіму ў Полацк. Еўфрасіння стала першай усходне-славянскай жанчынаю, якую праваслаўная царква абвясціла святой. Еўфрасіння шануецца як нябесная заступніца Беларускай зямлі.

Дзень памяці святой адзначаецца



# Бібліяграфія


1. Арлоў, У. А. Асветніца з роду Ўсяслава : Ефрасіння Полацкая [Тэкст] / У. А. Арлоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 53 с. – (Нашы славутыя земляки).

2. Арлоў, У. А. Еўфрасіння Полацкая [Тэкст] = Евфросиния Полоцкая / У. А. Арлоў. – Мінск : Маст. літ. : Славяне, 1992. – 224 с. – (Святыя зямлі беларускай).

3. Апісаньне крыжа, прынесенага Прападобнаю Эўфрасіньняй у дарунак Полацкаму манастыру [Тэкст] // Спадчына. – 1996. – № 6. – С. 91–99.

4. Бирюкова, Л. М. Слава тебе, святой свет преподобной Евфросинии Полоцкой! [Текст] : пособие / Л. М. Бирюкова. – Мінск : Беларусь, 2003. – 112 с.

5. Лойка, А. А. Ефрасіння Полацкая [Тэкст] / А. А. Лойка // Старабеларуская літаратура : падручнік / А. А. Лойка. – Мінск : Выш. шк., 2001. – С. 74–83.

6. Ефрасіння Полацкая [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 13–20.

# СІМЯОН ПОЛАЦКІ

Сімяон Полацкі, сапр. Самуіл Гаўрылавіч, паводле некаторых звестак – Емяльянавіч Пятроўскі-Сітніяновіч: 1629—25.8.1680 г. Беларускі і рускі пісьменнік, філосаф-асветнік, перакладчык, педагог, тэолаг, грамадскі і царкоўны дзеяч. Нарадзіўся ў Полацку. Паходзіў, як мяркуюць, з купецкага саслоўя. Атрымаў адукацыю ў Кіева-Магілянскім калегіуме (каля 1650 г.) і Віленскай езуіцкай акадэміі (да 1653 г.). У віленскі перыяд жыцця стаў манахам уніяцкага ордэна базыльян. Але гэта не перашкодзіла яму быць лаяльным дзеячам праваслаўнай рускай царквы ў Маскве. З сярэдзіны 1650-х да 1664 г. – настаўнік брацкай школы ў Полацку, пры Богаяўленскім манастыры. Каля 1656 г. прыняў праваслаўнае манаства пад імем Сімяон.






Пісаў вершы, прамовы, навуковыя трактаты. Акрамя роднай беларускай мовы, дасканала валодаў лацінскай, польскай, царкоўнаславянскай, рускай. З прыходам Сімяона вакол манастыра згуртавалася кола таленавітых беларускіх літаратараў і педагогаў. Ён шмат стараўся для праваслаўнага брацтва, аднак прытрымліваўся талерантнасці, ухіляўся ад крытыкі каталіцызму, імкнуўся да ўзгаднення дагматычных разыходжанняў.

У полацкі перыяд творчасці Сімяон пісаў пераважна па-беларуску, кніжным урачыстым стылем, набліжаным да царкоўнаславянскай мовы. Яго раннія вершы мелі рэлігійна-культавае прызначэнне. Характэрная рыса яго твораў гэтага перыяду – патрыятызм, любоў і пашана да свайго народа, роднага горада і краю.

Сімяон арганізаваў пры Заіконаспаскім манастыры “лацінскую” школу для падрыхтоўкі служачых Тайнага прыказа – асабістай канцылярыі цара. Ён стаў разам з вучоным візантыйцам Паісіем Лігарыдам дарадчыкам цара па царкоўных справах, перакладчыкам і рэдактарам. С. Полацкі стаў першым прыдворным паэтам расійскіх цароў. Яго запрашалі на прыдворныя ўрачыстасці, дзе паэт чытаў свае вершаваныя віншаванні.







Сярод першых кніг надрукаваў падручнік для дзяцей – “Буквар мовы славенскай”. Пераклаў на вершы і выдаў у сваёй друкарні “Псалтыр рыфматворны”, які стаў папулярным песеннікам сярод адукаваных людзей таго часу.

Яго пяру належаць тэалагічны трактат, зборнікі пропаведзяў, вершы, п’есы. Энцыклапедычны характар носяць зборнікі яго царкоўна-хрысціянскіх “слоў” і “казанняў” “Абед душэўны” і “Вячэра душэўная”. Аснову літаратурнай спадчыны Сімяона Полацкага складаюць выдадзеныя пасмяротна зборнікі “Ветраград мнагацветны” (у перакладзе на сучасную мову – “Сад шматколерны”) і “Рыфмалагіён, або вершаслоў”. Першы служыў для рускай публікі сапраўднай энцыклапедыяй ведаў па гісторыі, антычнай міфалогіі, філасофіі, тэалогіі, маралі і хрысціянскай сімволіцы. Драматычныя творы з другога зборніка ставіліся ў прыдворных тэатрах Крамля. Так з драматургіі С. Полацкага ў Расіі пачынаўся прафесійны тэатр. Увесь час службы пры маскоўскім двары Сімяон Полацкі займаўся таксама перакладчыцкай дзейнасцю. Перакладаў з латыні і польскай мовы, літаратурна апрацоўваў папулярныя тады свецкія і царкоўныя творы.






За год да смерці асветнік працаваў над праектам рускай вышэйшай школы на ўзор Кіева-Магілянскай акадэміі. Мелася на ўвазе выкладанне ў ёй не толькі грэчаскай мовы і багаслоўя, але і дасягненняў еўрапейскай гуманітарнай навукі і культуры, лацінскай мовы і натурфіласофіі. Пісьменнік памёр на 51-м годзе жыцця.

Літаратурная, багаслоўская і навукова-асветніцкая спадчына Сімяона Полацкага шматгранная і не перастае здзіўляць даследчыкаў сваёй энцыклапедычнасцю. Сам пісьменнік паспеў надрукаваць толькі асобныя свае творы. Буйнейшыя яго сачыненні былі выдадзены пасмяротна ў XVIII–XX ст. Паводле рашэння ЮНЕСКА імя Сімяона Полацкага было ўнесена ў каляндар памятных дат 1980 г.

У 1990 выдавецтва "Мастацкая літаратура" ўпершыню апублікавала большасць вершаў паэта беларускага перыяду і частку твораў маскоўскага перыяду, якія былі вядомы толькі па рукапісных зборах.



# Бібліяграфія

1. Воронько, Е. Д. "Муж благоверный, народу полезный..." : 375 лет со дня рождения Симеона Полоцкого [Текст] / Е. Д. Воронько // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 7. – С. 35–37.

2. Ігнатаў, У. К. Духоўна-філасофская спадчына Кіева-Магілянскай Акадэміі і беларуская асветніцкая думка эпохі барока [Тэкст] / У. К. Ігнатаў // Весці АНБ. Серыя гуманітарных навук. – 1996. – № 1. – С. 10–16.

3. Киселева, М. С. Барочная антропология: нравственное богословие в проповедях Симеона Полоцкого [Текст] / М. С. Киселева // Вопросы философии. – 2008. – № 7. – С. 115–129.

4. Сидорович, Л. Н. Выдающийся деятель восточнославянской культуры Симеон Полоцкий [Текст] / Л. Н. Сидорович // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2006. – № 1. – С. 87–91.

5. Сімяон Полацкі [Тэкст] // Гісторыя беларускай літаратуры : старажытны перыяд : вучэб. дапам. для філал. пед. ВНУ / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі [і інш.] ; пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 3-е выд. – Мінск : Выш. шк., 1997. – С. 276–289.

6. Сімяон Полацкі [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі :

# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА

Францыск Скарына (1490–1551) - першадрукар, мысліцель-асветнік, гуманіст, пісьменнік, мастак-графік, батанік і астраном.

Першапачатковую адукацыю Скарына атрымаў у доме бацькоў, там навучыўся чытаць па Псалтыры і пісаць кірылічнымі літарамі. Латынь ён засвойваў, хутчэй за ўсё, у школе пры каталіцкім касцёле ў Полацку ці Вільні. У 1504 г. паступіў ва ўніверсітэт у Кракаве. У 1506 г. атрымаў сваю першую вучоную ступень бакалаўра. Каб працягваць вучобу на самых прэстыжных факультэтах універсітэтаў Еўропы, Скарыну трэба было атрымаць яшчэ і ступень магістра мастацтваў. Дакладна невядома, зрабіў ён гэта ў Кракаўскім ці іншым універсітэце, але ў 1512 г. прыбыў у Італію ў праслаўлены Падуанскі ўніверсітэт ужо маючы ступень магістра свабодных навук. 9 лістапада 1512 г. у Падуанскім універсітэце Скарына атрымаў вучоную ступень доктара ў галіне медыцынскіх навук. Пасля гэтага звесткі пра Скарыну губляюцца на пяць гадоў. Недзе паміж 1512–1517 гг. вучоны з’явіўся ў Празе – цэнтры чэшскага кнігадрукавання.



Першым з пражскіх выданняў Біблii Скарыны быў Псалтыр (1517). Услед за ім выйшлі яшчэ 22 кнігі Старога Запавету, прычым выбраны былі з Біблii самыя важныя і цікавыя для чытача кнігі, менавіта тыя, якія ў тагачасных умовах маглі быць выкарыстаны ў асветніцкіх і выхаваўчых мэтах, з'яўляліся навучальнымі выказваннямі старажытных мудрацоў, змяшчалі звесткі па старажытнай гісторыі, летапісныя эпізоды і любоўныя песні. Скарына клапаціўся, каб кніга яго была зразумелай чытачам. Для гэтага на палях лістоў рабіў пераклад на сучасную яму мову і даваў тлумачэнні асобным царкоўнаславянскім словам, якія, на яго думку, маглі быць незразумелымі для простых, малаадукаваных людзей.

Да таго ж пад уплывам новых павеваў у грамадскай думцы Скарына жадаў вывесці Свяшчэннае Пісанне з абмежаванага царкоўнага ўжытку і зрабіць яго здабыткам шырокіх мас грамадства.



У 1520–1521 гг. Скарына пакінуў Прагу і пераехаў у Вільню. Першае віленскае выданне – “Малая падарожная кніжка”. Гэту назву Скарына даў сукупнасці выданняў, выпушчаных ім у Вільні каля 1522 г. Усяго ў склад “Малой падарожнай кніжкі” ўваходзяць: “Псалтыр”, “Часасловец”, “Акафіст магіле Гасподняй”, “Канон магіле Гасподняй”, “Акафіст святому Міколе” і інш., а таксама “Саборнік”, у які ўключаюцца “Святцы” і “Пасхалія”, і агульнае пасляслоўе “Писаны и речи в сей Малой подорожной книжце по ряду кратце положены суть”.

У 1525 г. Скарына выпусціў у Вільні кірыліцай адну з найбольш распаўсюджаных кніг – Апостал. Гэта было яго першае дакладна датаванае і адначасова апошняе па часе друкавання выданне, выпуск якога быў лагічным і заканамерным працягам справы выдання біблейскіх кніг, пачатай яшчэ ў Празе. Як і “Малая падарожная кніжка”, Апостал 1525 г. прызначаўся для шырокага кола чытачоў. У шматлікіх прадмовах да кнігі, а ўсяго асветнік напісаў да Апостала 22 прадмовы і 17 пасляслоўяў, апісваецца змест раздзелаў, асобных пасланняў, растлумачваюцца “цёмныя” фразы.






пасля 1525 г. першадрукар ажаніўся з удавой віленскага купца Маргарытай і разам з жонкай прыняў удзел у гандлёвай справе брата Івана.

Вельмі цяжкім быў для Скарыны 1529 г. Летам у Познані памёр яго брат Іван. Францыск паехаў туды, каб заняцца спадчынай нябожчыка. У тым жа годзе раптоўна памерла Маргарыта. На руках Скарыны застаўся малалетні сын Сімяон. Родзічы нябожчыцы падалі на першадрукара ў суд, патрабуючы падзелу маёмасці. Падзеі прымусілі Скарыну выехаць у 1530 г. у Кёнігсберг пад апеку герцага Альбрэхта, але недзе ў сярэдзіне 1530 г. ён пакінуў гэты горад для вырашэння судовых спраў, звязаных са спадчынай жонкі. З сабой у Вільню першадрукар тайна забраў двух падданых герцага – урача і друкара. Гэта сведчыць пра тое, што яшчэ ў пачатку 1530 г. ён меў на мэце прадоўжыць кнігадрукаванне ў Вільні. Невядома, якія абставіны канкрэтна перашкодзілі першадрукару здзейсніць яго планы. Да пачатку 1530-х гг. не засталося ў жывых ні аднаго з былых мецэнатаў

У 1531 г. у Вільні ўзнікла эпідэмія, якая хутка распаўсюджвалася. У гэты час на Скарыну новай хваляй навaліліся крэдыторы брата. У лютым 1532 г. ён быў арыштаваны па неабгрунтаванай і нічым не падмацаванай даўгавой прэтэнзіі “іудзеяў-крэдытораў” Майсея і Лазара з Варшавы і Якаба з Познані. Але пакінуць Вільню Скарыну прымусілі не гэтыя падзеі. Свецкае кнігадрукаванне выклікала процідзеянне духавенства як каталіцкага, так і праваслаўнага. У сярэдзіне 1530-х гг. Скарына канчаткова пакінуў Вільню і пераехаў у Прагу. Ён прыняў запрашэнне чэшскага караля Фердынанда I на пасаду каралеўскага медыка і садоўніка ў толькі што адкрытым батанічным садзе ў каралеўскім замку Градчаны. Даследчыкі лічаць, што пры чэшскім каралеўскім двары ён, хутчэй за ўсё,



# Бібліяграфія

1. Імя і справа Скарыны [Тэкст] : у чыіх руках спадчына. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 320 с.
2. "Зерцало жития..." [Тэкст] : з літ. спадчыны Ф. Скарыны. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. –220 с. – (Нар. пісьменнікі БССР).
3. Скарына Францыск [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 123–137.
4. Слова Скарыны [Тэкст]. – Мінск : Нар. асвета, 1984. – 48 с. – (Скарбы мовы).
5. Шматаў, В. Сярэдневяковае мастацтва кнігі і выданні Францыска Скарыны [Тэкст] / В. Шматаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 5. – С. 43–49.
6. Творы Ф. Скарыны [Тэкст] : Жанравая структура. Філасофскія погляды. Мастацтва слова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 144 с.
7. Лойка, А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае [Тэкст] : раман-эсэ / А. Лойка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. – 382 с.
8. Клышка, А. Францыск Скарына, альбо як да нас прыйшла кніга [Тэкст] / А. Клышка. – Мінск : Юнацтва, 1983. – 127 с.
9. Гарэцкі, М. Францыск Скарына [Тэкст] / М. Гарэцкі // Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 116–120.
10. Францыск Скарына [Тэкст] // Гісторыя беларускай літаратуры : старажытны перыяд : вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ВНУ / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі [і інш.] ; пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 3-е выд. – Мінск : Выш. шк., 1997. – С. 98–142.
11. Лойка, А. А. Францыск Скарына [Тэкст] / А. А. Лойка // Старабеларуская літаратура : падручнік / А. А. Лойка. – Мінск : Выш. шк., 2001. – С. 83–103.

# ІВАН ФЁДАРАЎ

Іван Фёдараў (каля 1510–1583) - асветнік, заснавальнік кнігадрукавання ў Расіі і на Украіне, а таксама ў Заблудаўскай друкарні (Гродзенскі павет).

Дакладных звестак пра яго паходжанне няма. Паводле некаторых звестак вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, дзе ў 1532 г. Іван Федараў атрымаў ступень бакалаўра. Па меркаванні даследчыкаў, друкарскую дзейнасць І. Фёдараў пачаў у 1550-я гг. у ананімных друкарнях ў Маскве. У 1563–1564 гг. ён разам з П. Мсціслаўцам выдаў першую дакладна датаваную рускую друкаваную кнігу “Апостал”, а ў 1565 г. – два выданні “Часоўніка” – кнігі для пачатковага навучання грамаце.

Царкоўныя ўлады былі незадаволены дзейнасцю І. Фёдарава і П. Мсціслаўца, імкнуліся абвінаваціць іх у ерасі. Таму ў 1566 г. яны пакінулі Маскву і накіраваліся ў Вялікае княства Літоўскае, дзе ў невялікім мястэчку Заблудаве Гродзенскага павета (зараз Беластоцкае ваяводства ў Польшчы) у маёнтку гетмана Р. Хадкевіча заснавалі друкарню. Для Беларусі вялікае значэнне меў менавіта гэты перыяд кнігавыдавецкай дзейнасці І. Фёдарава, у час якога ён развіў і памножыў лепшыя традыцыі беларускага першадрукара Ф. Скарыны.



На яго старонках змешчаны таксама першы друкаваны помнік старажытнай усходнеславянскай літаратуры “Слова на Ушэсце” Кірылы Тураўскага, творы візантыйскай і балгарскай пісьменнасці. Акрамя таго, у Заблудаве быў выдадзены “Псалтыр з Часаслоўцам” (1569–1570).

У канцы 1572 – пачатку 1573 г., пасля таго як Р. Хадкевіч вырашыў спыніць выдавецкую дзейнасць, асветнік пераехаў у Львоў і заснаваў там першую на Украіне друкарню, дзе ў 1574 г. убачыла свет першая ўкраінская дакладна датаваная кніга “Апостал”. Яна вызначаецца высокім паліграфічным мастацтвам. У кнізе змешчаны 3 гравюры: герб Р. Хадкевіча, выява апостала Лукі, геральдычная кампазіцыя з гербам г. Львова і друкарскім знакам І. Фёдарава.

У пачатку 1575 г. І. Фёдараў пераехаў у Астрог (Украіна), дзе паступіў на службу да заможнага князя К. Астрожскага і



“Азбукі”, дапоўненае паралельнымі грэка-славянскімі тэкстамі і помнікам старажытнабалгарскай літаратуры “Аб пісьмёнах” Чарнарызца Храбра пад назвай “Сказание како состави святый Кирил Философ азбуку по языку словеньску”. Потым на працягу 1580 г. выйшлі з друку “Псалтыр”, “Новы Запавет” з алфавітна-прадметным паказальнікам і адначасова зборнікам афарызмаў і крылатых слоў “Кніжку, збор рэчаў самых патрэбных...”. У 1581 г. у Астрогу І. Фёдараў надрукаваў “Храналогію” Андрэя Рымшы – першы ўсходнеславянскі друкаваны каляндар і першы асобна выдадзены твор беларускай паэзіі. У жніўні таго ж года выйшла першае поўнае выданне славянскай Бібліі кірылічнага шрыфту, так званая “Астрожская біблія”, якая стала апошняй у яго друкарскай дзейнасці. Арнаментальнае аздабленне і змест кнігі былі зроблены пад пэўным уплывам выданняў Ф. Скарыны. З 1582 г. асветнік зноў жыў у Львове і імкнуўся сабраць сродкі на адкрыццё новай друкарні.

У 1583 г. І. Фёдараў пабываў у



# Бібліяграфія

1. Глухов, А. "Ради братий моих" [Текст] : "Апосталу" Ивана Федорова – 430 лет / А. Глухов // Библиотека. – 1994. – № 7. – С. 55–58.

2. Лукомскі, В. Нацыянальнасьць і родапаходжаньне Івана Фёдарава, першадрукара ў Маскве [Тэкст] / В. Лукомскі // Спадчына. – 1997. – № 1. – С. 169–177.

3. Немировский, Е. Л. Иван Федоров в Белоруссии [Текст] / Е. Л. Немировский. – Москва : Книга, 1979. – 176 с.

4. Немировский, Е. Л. Иван Федоров около 1510 - 1583 [Текст] / Е. Л. Немировский ; отв. ред. А. А. Чеканов. – Москва : Наука, 1985. – 318 с. – (Науч.-биогр. сер.).

5. Прынскі, М. Тое-сёе аб друкарскіх майстрох беларускіх — Пётру Мсьціслаўцу, Івану Федаровічу а Грыню Івановічу [Тэкст] / М. Прынскі // Спадчына. – 1997. – № 2. – С. 126–139.

6. Фёдараў  Іван [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны  даведнік. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 146–151.

# СЫМОН БУДНЫ



Сымон Будны (каля 1530, Беластоцкае ваяводства –1593) - дзеяч беларускай культуры, мысліцель-гуманіст, філосаф, асветнік, рэлігійны рэфарматар, філолаг, паэт.

Нарадзіўся ў сям'і дробнага шляхціча. Месца нараджэння невядома. Скончыў факультэт свабодных мастацтваў Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве, магчыма, і тэалагічны факультэт Базельскага ўніверсітэта.

З сярэдзіны 1550-х гадоў па запрашэнні ўплывовага магната Мікалая Радзівіла (Чорнага) пасяліўся ў Вільні, дзе займаў спачатку пасаду катэхіста, які навучаў дзетак асновам веры, а потым, з 1558 г., настаўнічаў у пратэстанцкай школе ў Вільні.

У канцы 1550-х гадоў у Клецку пачалася яго надзвычай актыўная царкоўна-рэфарматарская дзейнасць. Разам з нясвіжскім старостам Мацеем Кавячынскім і Лаўрэнціем Крышкоўскім Будны заснаваў у Нясвіжы друкарню.

Хаця С. Будны непасрэдна не займаўся друкаваннем, яго вядучая духоўная роля ў першыя гады дзейнасці нясвіжскага выдавецтва бясспрэчна. Па сутнасці, быў адзіным аўтарам першых нясвіжскіх выданняў, бо толькі ён бліскуча валодаў беларускай мовай, кірылічнай пісьменасцю і мог падрыхтаваць гэтыя тэксты. Першае выданне мела загаловак "Катэхізіс".

На беларускай мове выйшла праца “Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам”. У 1574 г. у Лоску, што каля Валожына, С. Будны выдаў Новы Запавет, каментарыі да якога ўтрымлівалі крытычныя заўвагі да евангелісцкага твора. У гэтым жа годзе выдае працу “Абвяржэнне Чаховіца, які лічыць, што хрысціяніну нельга займаць дзяржаўную пасаду”.






У 1578 г. удзельнічае ў пасяджэнні Сінода ў Луцкавічах, дзе памкнуўся пераканаць у неабходнасці дзяржавы і ўраду сваіх польскіх апанентаў, што таксама прысутнічалі на нарадзе.

У 1583 г. С. Будны выдае новую кнігу “Пра свецкую ўладу” (адзіны экзэмпляр кнігі захоўваецца ў кніжным фондзе бібліятэкі графаў Чартарыйскіх у Кракаве).

Сымон Будны быў таленавітым і шырока дасведчаным літаратарам. Яму характэрна тэндэнцыя рэалістычнага прачытання Бібліі, набліжэнне яе да літаратурна-мастацкага твора.

Апошнія гады свайго жыцця С. Будны жыў і працаваў у вёсцы Вішнева (сёння Валожынскі раён Мінскай вобласці). Паводле сведчанняў тагачаснага пісьменніка Міхаіла Фрыбеліуса Алясніцкага Сымон Будны памёр 13 студзеня 1593 г. у доме

# Бібліяграфія

1. Будны Сымон [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 51–59.
2. Саверчанка, І. В. Сымон Будны – выдатны літаратар і асветнік-гуманіст [Тэкст] / І. В. Саверчанка // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 12. – С. 66–73.
3. Гарэцкі, М. Сымон Будны [Тэкст] / М. Гарэцкі // Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 122–123.
4. Сымон Будны [Тэкст] // Гісторыя беларускай літаратуры : старажытны перыяд : вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ВНУ / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі [і інш.] ; пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 3-е выд. – Мінск : Выш. шк., 1997. – С. 182–200.
5. Сымон Будны [Тэкст] : гуманіст і рэфарматар. – Мінск. : Універсітэцкае, 1993. – 223 с.

# ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ

Васіль Цяпінскі - гуманіст-асветнік, пісьменнік, кнігавыдавец, прадаўжальнік гуманістычных і культурна-асветніцкіх традыцый Ф. Скарыны.

Многае з жыцця Васіля Цяпінскага (Амельяновіча) застаецца нявысветленым да нашага часу. Ёсць меркаванні, што ён нарадзіўся ў вёсцы Цяпіна Чашніцкага раёна ў 1530-я г. у сям'і дробнага баярына Мікалая Амельяновіча. Упершыню імя Цяпінскага сустракаецца ў дакументах 1560-х гг.

Ёсць даведкі, што ён скончыў універсітэт у 1567 г., служыў малодшым афіцэрам коннай роты аршанскага старасты Ф. Кміты Чарнабыльскага. Маюцца вельмі сціплыя звесткі пра лёс і дзейнасць В. Цяпінскага ў 1558–1583 гг. Вядома толькі, што ў гэты перыяд ён удзельнічаў у Лівонскай вайне. Даследчыкі сведчаць, што ў Цяпіне, у сваім радавым маёнтку ён заснаваў



В. Цяпінскі напісаў да выдання сваю ўласную прадмову, у якой выказаў меркаванні па шэрагу пытанняў развіцця грамадства. Прадмова гэта захавалася ў рукапісе. Два экзэмпляры “Евангелля” цудам захаваліся і зберагаюцца ў Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу і Архангельскім краязнаўчым музеі. Кніга па тым часе вельмі добра аформлена, упрыгожана арнаментам, што сведчыць пра клопат выдаўца не толькі пра змест, але і знешні прывабны выгляд. Гуманіст і паслядоўнік праваслаўя выкарыстаў Евангелле для азнаямлення людзей са сваімі поглядамі на асвету, грамадскае ўсталяванне, рэлігійнае выхаванне грамадзян Вялікага княства Літоўскага. Тым самым В. Цяпінскі даў цэласную праграму рэфармавання школ, абгрунтаваў неабходнасць шырокага доступу да асветы дэмакратычных слаёў грамадства.

Перакананы гуманіст, асветнік і палітычны мысліцель, В. Цяпінскі з’яўляецца прыхільнікам Адраджэння, рэнесанснага руху на Беларусі, спрыяючы захаванню лепшых традыцый славянства.

Застаючыся вялікім дзеячам і палітычным мысліцелем сваёй эпохі, В. Цяпінскі падзяляў утапічныя ідэалы сваіх папярэднікаў са старажытнай Грэцыі і старажытнага Рыма адносна ўдасканалення вышэйшай магнацкай знаці Вялікага







# Бібліяграфія


1. Гарэцкі, М. Васіль Цяпінскі [Тэкст] / М. Гарэцкі // Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – С. 123–125.
2. Васіль Цяпінскі [Тэкст] // Гісторыя беларускай літаратуры : старажытны перыяд : вучэб. дапам. для філал. фак. пед. ВНУ / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі [і інш.] ; пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 3-е выд. – Мінск : Выш. шк., 1997. – С. 200–205.
3. Цяпінскі (Амельяновіч-Цяпінскі) Васіль Мікалаевіч [Тэкст] // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. Г. П. Пашкоў [і інш.].  – Мінск, 2002. – Т. 17. – С. 195.
4. Цяпінскі Васіль [Тэкст] // Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны  даведнік / гал. рэд. Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск, 1995. – С. 154–156.
5. Цяпінскі Васіль Мікалаевіч [Тэкст] // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал. Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2003. – Т. 6. Кн. 2. – С. 127–128.


**З матэрыяламі аб беларускіх асветніках можна пазнаёміцца ў бібліятэцы**

# Гарады, дзе адбывалася святкаванне Дня беларускай пісьменнасці:



























ОРША-940
Награждается:
It is awarded:
За установление радиосвязи(наблюдений) с радиостанцией EU940OR в 2007 году
For an establishment of QSO's (SWL) with radio station EU940OR
№
Менеджер диплома
EU6AA
1067


Заслаўль


МСТИСЛАВЛЬ


Mip


Поставы


Шклов
1535


Смаргонь
2009


Камянец
1276

**Усе гэтыя слаўныя імёны – гонар беларускай зямлі! Кожны з іх сваёй рознабаковай дзейнасцю закладваў падмурак беларускай нацыянальнай культуры, указваў на важную ролю асветы ў жыцці народа і падаваў выключны прыклад бескарыслівага служэння на гэтай ніве.**



# Дзякуем

# за

# ўвагу !

**Б і б л і я т э к а**
**УА ГДТУ ім. П. В. Сухога**
2 0 1 3 г.